алгоритмы звуковых эффектов музыкальных редакторов для наиболее полного отражения драматургии танца и балетмейстерской идеи.

Таким образом, практико-ориентированные методы работы с музыкальным материалом на дисциплине «Искусство балетмейстера» формируют у студентов умения и навыки практической работы, соответствующие современным требованиям в разнообразных сферах деятельности хореографа, систему теоретических знаний, профессиональную мобильность и компетентность, что соответствует образовательному стандарту и делает молодых специалистов конкурентоспособными.

1. Абдоков, Ю. Б. Музыкальная поэтика хореографии: пластическая интерпретация музыки в хореографическом искусстве: Автореферат дис. … канд. искусствоведения: 17.00.01 / Ю. Б. Абдоков. – Москва, 2009. –18 с.

2. Карчевская, Н. В. Особенности внутривидового синтеза пластического текста и музыкального материала в современных хореографических произведениях / Н. В. Карчевская // Культура. Наука. Творчество: VII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 29–30 мая 2013 г.: сб. науч. ст. / Мин-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств; науч. ред. В. Р. Языкович. – Минск: БГУКИ, 2013. – С. 98-102.

3. Филановская, Т. А. Структура компетентностной модели будущего педагога-хореографа / Т. А. Филановская // Высшее образование в России. – 2010. - № 11. – С. 144-149.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# «СЛОВА – УСЯГО АСНОВА»: МОВА І ЛІТАРАТУРА ЯК ВАЖНЕЙШЫЯ СРОДКІ Ў ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ РАБОТНІКАЎ СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

***Пісарэнка А.М.,*** *загадчык кафедры беларускай і замежнай філалогіі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

***Варапаева В.С.,*** *прафесар кафедры беларускай і замежнай філалогіі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

Чалавек жыве ў свеце рэчаіснасці і мастацтва (у прыватнасці, мастацтва слова). У літаратурных вобразах ён імкнецца знайсці паўсядзённае, перажытае, а ў рэальнасці шукае тых герояў, з якімі сустрэўся, чытаючы кнігі, на тэатральнай сцэне, на экранах тэлебачання. Менавіта ў свеце вобразаў, створаных мастакамі слова, жыццё паўстае перад намі не толькі такім, якое яно ў рэчаіснасці, але і такім, якім яно можа і павінна быць у люстэрку літаратуры; яно іншае, адноўленае, менавіта ў свеце маральных нормаў, ідэалаў прыгожага.

Чалавек аднаўляе рэчаіснасць, часам увасабляе яе ў нерэальных мастацкіх вобразах. Пазнанне свету з'яўляецца асноўнай для яго дзейнасцю. Літаратура заўсёды была магутным сродкам пазнання, і ў гэтым яна падобная да навукі, аднак у іх розныя метады аналізу і абагульнення: мастак і вучоны, пазнаючы адну і тую самую рэчаіснасць, гавораць пра гэта на розных мовах: адзін гаворыць мовай вобразаў, другі – мовай фактаў.

Мастацтва пачынаецца там, дзе мастацкі тып свядомасці атрымлівае прадметна-вобразнае ўвасабленне. Мастацтва – гэта спецыфічная дзейнасць чалавека, якая вынікам сваёй працы мае мадэль рэчаіснасці. Вядома, што на першых этапах развіцця чалавецтва мастацтва (утылітарнае і сінкрытычнае) спалучала ў сабе розныя формы чалавечных паводзін. Гук, колер, рух рэалізоўваюцца ў сюжэтна-арганізаваным дзеянні і г. д. Першапачатковая функцыя мастацтва – дапамагчы чалавеку пазнаць свет, каб забяспечыць у ім месца свайму роду. Потым яно ўскладнялася, размяжоўвалася на віды, але шматграннасць мастацтва не можа схаваць яго першапачатковай функцыі. Менавіта таму карыснае ў ім, з пункту гледжання чалавека, станавілся маральным і прыгожым.

Час ішоў, былі спрэчкі паміж фізікамі і лірыкамі наконт таго, што важней: навука ці мастацтва. Нам здаецца, што кропку ў гэтай спрэчцы ў свой час паставіў А. Энштэйн. У 1952 г. у адным з выступленняў ён папярэджвае тых, хто прапаноўваў размежаваць навуку і мастацтва ў імя максімальнай канцэнтрацыі напруг у развіцці тэхналагічнай цывілізацыі: – "Недостаточно научить человека специальности, – говорил Эйнштейн. – Таким путём он превратится в особого рода полезную машину, но не станет полноценной личностью. Он должен получить представление о том, что является хорошим и моральным. Иначе со своим специализированными знаниями он будет скорее напоминать хорошо обученную собаку, чем гармонически развитую личность… Чрезмерное увлечение строгой системой и ранней специализацией, учитывающей только непосредственную пользу, убивает дух, от которого зависит вся культурная жизнь, а значит в конечном счёте и расцвет специальных отраслей науки".

Літаратура як від мастацтва мае справу з незвычайным матэрыялам – моваю: для стварэння вобраза паэт і празаік выкарыстоўваюць слова. З дапамогаю слова вызначаецца сэнс чалавечых пачуццяў і іх найтанчэйшых адценняў. Слова выклікае ў чытача адказ, яно адкрывае самыя патаемныя пачуцці душы і аднаўляе працэс унутранага жыцця ва ўсёй яго складанасці. Такім чынам, першаасновай літаратуры з'яўляецца слова, асноўная яе зброя і – разам з фактамі, з'явамі жыцця – матэрыял літаратуры – калісьці сцвярджаў А. М. Горкі. Для літаратурнага вобраза, які ствараецца з дапамогаю такой зброі і матэрыяла, як мова, фактычна няма ў свеце



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нічога закрытага. Дзіўна, але факт: з дапамогаю літаратурных вобразаў чалавецтва змагло прадметна ўявіць у часы Жуля Верна падводную лодку і лятальныя апараты, Г. Уэлс зрокава ўявіў сацыяльныя супярэчнасці, А. Талстой – лазерны апарат і г. д. Чалавецтва настойліва ўглядаецца ў будучыню; яно звяртаецца па прагнозах да навукі і мастацтва. Часам лічыцца, што чытанне, нават праграмных твораў, не зусім патрэбна, прычым і на ўзроўні дзяржаўнай палітыкі. Як зразумець тады, што ў дзяржаўным стандарце адукацыі гуманітарных ВНУ няма такога прадмета, як літаратура, ці, напрыклад, катастрафічнае змяншэнне гадзін.

Калі сыходзіць з таго, пра што гаварылася вышэй, і ўявіць прафесіяграму работніка культуры, то атрымліваецца яна, літаратура, надзвычай неабходная. Якім павінны быць гэты работнік? Думаецца, што прафесіяграма яго павінна быць прыкладна наступнай: 1. Шырокі культурны дыяпазон: веданне сваёй спадчыны (мовы, гісторыі, музыкі, выяўленчага мастацтва, літаратуры (мастацтва слова) і г. д.); 2. Прафесійныя ўменні і навыкі для кожнай спецыяльнасці свае (сцэнічная мова, рух і г. д.); 3. Веданне псіхалогіі тых, з кім будзеш працаваць (асабліва дзяцей); 4. Уменне суразмоўніцтва, бездакорнае валоданне мовай (беларускай, рускай і інш.), асабліва ў сферы менеджменту; 5. Педагагічны такт (шчырыя, паважлівыя адносіны да людзей і інш.); 6. Імкненне пастаянна вучыцца, папаўняць свой багаж.

Нават без глыбокага пранікнення ў сутнасць прафесіяграмы відаць, што без мовы, літаратуры, педагогікі, псіхалогіі немагчыма падрыхтаваць прафесіянала, сапраўднага носьбіта айчыннай культуры.

З другога боку, відаць, варта падумаць і пра новыя падыходы ў выкладанні гэтых прадметаў. У прыватнасці, магчыма і адбор тэкстаў, і выкладанне літаратуры здзяйсняць па прынцыпе праблемна-тэматычным. Што маецца на ўвазе: адбор літаратуры для самастойнага чытання студэнтаў можа складацца з некалькіх блокаў-праблем, якія актуальныя, зразумелыя сённяшнім студэнтам. Напрыклад, “чалавек у свеце людзей”, праблема “мастака і мастацтва”, “чалавек на вайне”, “не ўсё тое золата, што блішчыць” і г. д. У кожны блок для чытання і абмеркавання ўвойдуць самыя лепшыя творы (шэдэўры). Колькасць іх павінна быць абмежавана (3–4). Напрыклад, праблемы мастака і мастацтва (М. Багдановіч “Музыка”, Я. Колас “Сымон-музыка”, А. Куляшоў “Варшаўскі шлях”). Кожны з аўтараў па-свойму, сваімі сродкамі паказвае шлях творцы, пошукі самога сябе і адказу на пытанні “што такое сапраўднае мастацтва і якое яно павінна быць?”, “каму гэтае мастацтва павінна служыць?”.

Літаратура як від мастацтва сама з’яўляецца крыніцай стварэння вобразаў іншых відаў мастацтва. Цяжка ўявіць сабе песню без слоў, кіно і тэатр без тэксту, харэаграфічную пастаноўку без напісанага загадзя лібрэта і г. д. Усё гэта так званая міжпрадметная сувязь, якая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павінна ажыццяўляцца і дэманстравацца пры выкладанні курса як беларускай, так і замежнай літаратуры, асабліва ў ВНУ сферы культуры. Узаемасувязь літаратуры з іншымі відамі мастацтва, узаемадзеянне розных відаў слоўных і няслоўных вобразаў, інтэрпрэтацыя аднаго віда мастацтва сродкамі іншых дазваляе ствараць сусветнавядомыя шэдэўры: так, экранізацыя рамана Л. Талстога “Анна Каренина”, сусветна вядомы мюзікл “Маленькі прынц” А. Сент-Экзюперы, мюзікл “Дуброўскі” (А. С. Пушкін), кінафільм “Сабака на сене” (Лопэ дэ Вега) і г. д.. Пералічаныя творы дазваляюць гаварыць пра тое, што літаратура з’яўляецца першаасновай стварэння вобразаў.

У БДУ культуры і мастацтваў значная ўвага надаецца папулярызацыі літаратуры. Студэнтам, напрыклад, прапанаваныя эксперыментальныя ДПВ:

1. “Беларуская драматургія і тэатр”: выкладаецца студэнтам, якія навучаюцца па напрамку спецыяльнасці “народная творчасць (тэатральная)”. Асноўнай мэтай вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў разумення “першаснасці слова” і яго рэалізацыя ва ўсіх відах мастацтва, у прыватнасці ў драматургіі;

2. “Беларуская паэзія ў музычным увасабленні”: выкладаецца студэнтам наступных спецыяльнасцяў (напрамкаў спецыяльнасцяў): мастацтва эстрады (інструментальная музыка), мастацтва эстрады (спевы), мастацтва эстрады (рэжысура), народная творчасць (харавая музыка), народная творчасць (інструментальная музыка). Змест вучэбнай дысцыпліны накіраваны на азнаямленне студэнтаў (будучых прафесіяналаў у сферы музычнага мастацтва Беларусі) са спецыфікай вершаванага слова, яго адметнасцю, арыгінальнасцю паэтычных вобразаў;

3. “Интерпретация литературных произведений другими видами искусства”: выкладаецца студэнтам наступных спецыяльнасцяў (напрамкаў спецыяльнасцяў): рэжысура свят (народныя) народная творчасць (народыя ремёствы). Мэта гэтай вучэбнай дысцыпліны – раскрыць асаблівасць і шматграннасць сусветнага літаратурнага працэсу, даць уяўленне пра змены мастацка-светапоглядных сістэм, спрыяць глыбокаму веданню літаратуры, яе выяўленчых сродкаў, сувязяў з іншымі відамі мастацтва;

4. ДПВ “Мастацкія плыні ў літаратуры ХХ ст.”: выкладаецца студэнтам наступных спецыяльнасцяў (напрамкаў спецыяльнасцяў): дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў), рэжысура свят (народныя), харэаграфічнае мастацтва (па напрамках), бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках). Мэта вучэбнай дысцыпліны – раскрыць адметнасць і шматстайнасць сусветнага літаратурнага працэсу, сістэматызаваць і паглыбіць веды пра асаблівасці развіцця беларускай і сусветнай літаратуры ХХ ст., пра

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыфіку асноўных мастацкіх напрамкаў XX ст. і іх месца ў літаратурным працэсе XX ст..

Найпершая задача выкладчыка літаратуры – навучыць студэнтаў вызначаць галоўную думку твора, вызначаць задуму аўтара: што хацеў паэт / празаік / драматург данесці чытачу ў сваім творы. Затым трэба "вывесці" чытача-студэнта да межы твора, гэта значыць паразважаць над жыццёвымі сітуацыямі, на якія "праектуецца" галоўная думка твора, а затым, безумоўна, варта з улікам спецыялізацый студэнтаў прапанаваць стварыць твор уласны: магчыма музыку на верш напісаць, стварыць літаратурна-музычную, харэаграфічную ці інш. кампазіцыю па матывах твораў аднаго аўтара або на зададзеную тэму, стварыць пастаноўку (мініп'есу) па творы (урыўку з твора), падрыхтаваць ужо вядомыя песні на словы пэўнага паэта, прэзентацыю творчасці таго ці іншага аўтара. Тады гэта і будзе практыка арыентаваным навучаннем літаратуры ў ВНУ сферы культуры. Дэкламацыя вершаў на памяць з вызначэннем ідэі, магчыма, на практычных занятках, а ў межах КСР можна прапаноўваць больш аб'ёмныя заданні.

Такім чынам, літаратуры як від мастацтва, і як вучэбная дысцыпліна павінна быць скіравана на выхаванне і адукацыю гарманічна развітай асобы.

У сваю чаргу, мова – сродак пазнання і апісання свету, самарэалізацыі асобы. Праз мову чалавек звязваецца са светам, прэзентуе сябе ў свеце, ладзіць стасункі як асабістая, так і прафесійныя. Студэнта сёння варта арыентаваць на тое, што сучасны інтэлігент павінен ведаць як мінімум тры мовы: беларускую як тытульную мову нацыі, рускую як другую дзяржаўную і англійскую як адну з моў, якая забяспечвае міждзяржаўныя зносіны.

Спецыялісты з вышэйшай адукацыяй закліканы скласці культурную эліту нацыі, уяўляючы сабой эталоны яе адукаванасці, выхаванасці і маральнасці, закліканы фарміраваць і паглыбляць культурнае асяроддзе, найважнейшае месца ў якім займае моўнае асяроддзе. Маўленне чалавека – неад'емная частка яго іміджу, знешняя праява яго ўнутранай абаяльнасці. Калі прафесійная падрыхтоўка спецыяліста накіравана на паглыбленае засваенне пэўнай сферы чалавечай дзейнасці і тым самым вылучэнне гэтай дзейнасці ў агульнай структуры дынамічнага свету, то моўная падрыхтоўка накіравана на цэласнае, інтэгральнае ўспрыняцце гэтага свету, а таксама на якаснае самавыражэнне асобы.

У сувязі з вышэйадзначаным бачыцца неабходнасць захаваць у БДУКМ такі прадмет, як Гісторыя літаратуры, ці Беларуская і сусветная літаратура: Беларуская літаратура, Беларуская і сусветная літаратура: Сусветная літаратура. Па магчымасці не скарачаць, а нават павялічыць колькасць адведзеных на дадзены прадмет гадзін, што дасць магчамасць разглядаць літаратурныя творы ў кантэксце іншых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

відаў мастацтва ці як крыніцу стварэння іншых твораў (харэаграфічных, музычных ці інш.); пакінуць тыя дысцыпліны па выбары, якія адлюстроўваюць узаемасувязь, узаемадзеянне літаратурных твораў з творамі іншых відаў мастацтва, скіроўваюць спецыяліста на дасканальнае валоданне мовай у межах прафесійнага маўлення, напрыклад, курс "Стылістыка і культура маўлення", "Інтэрпрэтацыя літаратурных твораў іншымі відамі мастацтва","Маўленчае ўздзеянне ў СМІ і рэкламе", "Культура прафесійнага маўлення", "Беларуская драматургія і тэатр", "Мастацкія плыні ў літаратуры XX ст."

## УВОДНАЯ ЛЕКЦЫЯ ЯК АДНА З ФОРМ ПРАФАРЫЕНТАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ СА СТУДЭНТАМІ

***Лейко Н.А.***, *прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

У вучэбным плане падрыхтоўкі спецыялістаў па накірунку "Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць" курс "Каталагізацыя дакументаў" аднесены да базавых прафесіянальных дысцыплін. Задача курса заключаецца ў аваладанні студэнтамі прафесіянальных ведаў, уменняў і навыкаў у галіне фарміравання бібліяграфічнага запісу, сістэматызацыі і прадметызацыі дакументаў, арганізацыі, вядзення і выкарыстання каталогаў.

Каталагізацыя і класіфікацыя з'яўляюцца асноўнымі інструментамі пры адборы інфармацыі.

Галоўная задача вышэйшай школы на сучасным этапе – забяспечыць падрыхтоўку спецыялістаў высокай кваліфікацыі, якія маюць адпаведную навуковую і практычныю падрыхтоўку, дасканала валодаюць сваёй спецыяльнасцю і здольныя да творчай дзейнасці.

"Каталагізацыя дакументаў" – адзін з асноўных спецыяльных курсаў. Ён з'яўляецца фундаментам, які садзейнічае паспяховаму вывучэнню амаль што ўсіх дысцыплін бібліятэказнаўчага, бібліяграфазнаўчага і інфармацыйнага цыклаў.

Вопыт падрыхтоўкі спецыялістаў паказвае, што неабходна пастаянна працаваць са студэнтамі, не толькі асвойваць новы матэрыял, але і вучыць іх саміх шукаць новае, незвычайнае, неабходнае для сваёй прафесіі, ставіць новыя задачы, звязаныя са сваёй прафесіяй. Вельмі добра калі студэнты не толькі выкладаюць, пераказваюць думкі знакамітых вучоных, але і ўмеюць каменціраваць іх, дапаўняць канкрэтнымі прыкладамі з работы бібліятэк, гэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ